

**У польскім горадзе Гданьску з'явіўся помнік Янку Купалу – такое рашэннне прынялі дэпутаты гарадской рады на прапанову беларускага консульства.**

Адкрыццё помніка было запланавана на 7 ліпеня, пад час святкавання 125-х ўгодкаў з дня нараджэння беларускага песняра.

Пляцоўка пад помнік падрыхтаваная на гданьскай вуліцы Купалы.




## Вядомыя творы Янкі Купалы

### Паэмы

Бандароўна
Адплата кахання
Курган
Магіла льва
Тарасова доля

### Драматычныя паэмы

Адвечная песня
Сон на кургане

### П'есы

Паўлінка
Прымакі


**ДУК "Астравецкая раённая бібліятэка"**

Адрас г. Астравец
пр-т Энергетыкаў, 2

Тэлефон: 8-015-91-21-0-90
Эл. пошта: ostrov_bibl@mail.ru


*Аддзел маркетынгу*
*і сацыякультурнай дзейнасці*

*Серыя «Іх імёнамі названы вуліцы Астраўца»*

# Янка Купала



2022

*Янка Купала пражыў нялростае жыццё, поўнае цяжкасцей і выпрабаванняў. Аднак яго высокія якасці як чалавека, грамадзяніна і творцы: сумленнасць, высакароднасць, гуманізм, любоў да свайго народа і Айчыны, вернасць вызначальнай ідэі ўсёй яго творчасці - нацыянальнаму, сацыяльнаму і духоўнаму разняволенню людзей, раскрытай на высокім мастацкім узроўні, заставаліся нязменнымі і неаспрэчнымі з цягам часу. Беларускі пясняр стаіць ў шэрагу тых вялікіх мастакоў свету, якім дадзена глыбока спазнаць сутнасць свайго часу, народа, яго гісторыі і выказаць гэта ў яскравай, толькі ім уласцівай форме.*

*Нельга не пагадзіцца з наступнай ацэнкай беларускіх літаратуразнаўцаў: "Творчасць Янкі Купалы - летапіс жыцця беларускага народа, адбітак нацыянальнага характару, нацыянальнага светаразумення і паэтычнага светаўспрымання на пераломных гістарычных рубяжах 1-й паловы XX ст. Яна вызначаецца глыбокай народнасцю, мастацкай арыгінальнасцю, нацыянальнай адметнасцю".*

*Вельмі дакладным з'яўляецца і выказванне аб Янке Купалу рускага паэта А.Т. Твардоўскага: "Лірык па складу свайго цудоўнага таленту, пясняр Беларусі, які выявіў сэрца яе з незвычайнай сілай, ён усёй сваёй паэтычнай існасцю як бы сімвалізаваў творчую моц народа".*

*Можна сцвярджаць, што гучныя азначэнні, якія часта ўжываюць у адносінах да Купалы: вялікі пясняр беларускага народа, прарок нацыянальнага адраджэння і нават стваральнік нацыі з'яўляюцца цалкам дарэчнымі.*

*Янка Купала належыць да тых выдатных асоб, чые творы маюць вечную каштоўнасць, з'яўляюцца класічнымі для нацыянальнай і сусветнай культуры.*



**Янка Купала ў перыяд працы ў "Нашай ніве". Вільня 1908г.**



**І. Луцэвіч (Я. Купала) са сваёй жонкай Уладзіславай Францаўнай Станкевіч. 1916 г.**



**Я. Купала ў рабочым кабінеце. г. Мінск. 2 лістапада 1940 г.**

Сапраўднае імя Янкі Купалы - Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Ён нарадзіўся 7 ліпеня 1882 г. у фальварку Вязынка Мінскага павета Мінскай губерні.

У **1908-1909 гг.** Янка Купала жыў у Вільні, працаваў у рэдакцыі газеты "Наша ніва" і адначасова бібліятэкарам у прыватнай бібліятэцы.

У **1909-1913 гг.** Я. Купала займаўся на агульнаадукацыйных курсах А.С. Чарняева ў Санкт-Пецярбургу, якія паводле слоў паэта, далі яму "вельмі многа... сістэматызавалі хаатычныя веды", там ён вывучаў тэорыю і гісторыю літаратуры. Купала пазнаёміўся з прадстаўнікамі перадавой рускай інтэлігенцыі, рэвалюцыйна настроенай моладдзю, удзельнічаў у пасяджэннях Беларускага навукова-літаратурнага гуртка - культурна-асветнай арганізацыі студэнтаў-беларусаў Санкт-Пецярбургскага універсітэта.

**З кастрычніка 1913 да жніўня 1915 г.** Я. Купала зноў у Вільні, працуе ў "Беларускім выдавецкім таварыстве", у газеце "Наша ніва". Як рэдактар гэтага выдання падвяргаўся судовому пераследаванню царскіх уладаў. З удзелам Купалы арганізоўваліся літаратурныя вечары, сустрэчы з рускімі, літоўскімі і польскімі пісьменнікамі.

Летам 1915 г. у сувязі з набліжэннем нямецкіх войск перастала выходзіць "Наша ніва", і Купала выехаў з Вільні.

**З верасня 1915 г.** знаходзіўся ў Маскве, займаўся ў народным універсітэце А.Л. Шаняўскага на гісторыка-філасофскім факультэце. У студзені 1916 г. узяў шлюб з Уладзіславай Францаўнай Станкевіч. У хуткім часе быў прызваны ў армію. Служыў у Мінску, Полацку, Смаленску старшым рабочым у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін.

**З студзеня 1919 г.** Я. Купала пастаянна жыў у Мінску. Працаваў бібліятэкарам ва ўстанове Народнага камісарыята асветы

**З 1921 да 1930 г.** Я. Купала актыўна ўдзельнічаў у літаратурна-грамадскім і культурна-мастацкім жыцці, у тым ліку ў стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта, нацыянальнага тэатра, рэспубліканскіх выдавецтваў, уваходзіў у склад камісіі па стварэнні Інстытута беларускай культуры. 10 чэрвеня 1925 г. Савет Народных Камісараў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) прысвоіў Янку Купалу - першаму з беларускіх пісьменнікаў - ганаровае званне народнага паэта Беларусі.

**З 2-й паловы 1920-х гг.** Я. Купалу адкрыта пачалі абвінавачваць у так званай нацдэмаўшчыне

**У 1937 г.** Я. Купала зноў аказаўся ў спісе чарговых ахвяраў рэпрэсій, аднак, хоць мясцовыя рэпрэсіўныя органы і звярталіся да вышэйшага кіраўніцтва па дазвол на яго арышт, такой санкцыі на атрымалі. Пры гэтым у студзені 1939 г. Я. Купала быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

**У час Вялікай Айчыннай вайны** паэт жыў у Маскве, потым у пасёлку Пячышчы каля Казані. 10-га паверха) у гасцініцы "Масква" пры невысветленых абставінах.

**У 1962 г.** урна з прахам паэта перавезена ў Мінск і пахавана на Вайсковых могілках.